**К. М. Бурылава**

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Пасля далучэння зямель Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі яе ўрад сутыкнуўся са значнымі праблемамі на гэтай тэрыторыі. Імператрыца Кацярына II так ахарактаразавала этнічны склад тагачаснага насельніцтва Беларусі: “Здесь население самое разнородное, сплошь да рядом обитают православные, католики, униаты, евреи, русские, поляки, чухонцы, немцы, курляндцы, словом, не увидишь двух крестьян одинаково одетых и говорящих правильно на одном наречии” (Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. 1772–1917, 2019). Такое “Вавилонское столпотворение”, на думку царыцы і большасці дваран Расійскай імперыі, магло прывесці да вялікай колькасці праблем для дзяржавы. Вось чаму выкараненне палітычнага сепаратызму ў новых правінцыях і умацаванне дзяржаўнага адзінства на тэрыторыі імперыі сталі галоўнымі мэтамі нацыянальнай палітыкі царызму.

Большасць магнатаў і шляхты прысягнулі новай уладзе і атрымалі роўныя з расійскім дваранствам правы, але страцілі прывілеі, якія былі ў іх у часы Рэчы Паспалітай. Тым не менш гэта не прадухіліла шляхецкага паўстання 1830–1831 гг. Пасля яго задушэння расійскі ўрад праз “разбор шляхты” – комплекс мерапрыемстваў, дзе кожны шляхціц павінен быў падцвердзіць сваё прывілеяванае становішча адпаведнымі дакументамі – імкнуўся знізіць узровень апазіцыйнасці беларускай шляхты да сябе. Паўстанне 1863 г. засведчыла, што царызму не ўдалося ў поўным аб’ёме вырашыць гэту задачу.

Становішча беларускіх сялян значна пагоршылася: замест падымнага падатку ўводзіўся падушны, паншчына і рэкрутчына сталі надзвычай цяжкімі павіннасцямі. Шмат вяскоўцаў уцяклі з праваслаўнай Расіі ў пратэстанцкую Прусію.

У мэтах спынення імклівага ўзмацнення ўплыву яўрэйскага прадпрымальніцтва ў эканоміцы ў 1791 г. была ўведзена “мяжа яўрэйскай аселасці”, якая замацоўвала магчымасць пражывання яўрэяў толькі ў межах заходніх губерняў. Яны былі абмежаваны ў магчымасцях атрымаць вышэйшую адукацыю, заняць чыноўніцкія пасады, нават працаваць чорнарабочымі на чыгунцы.

Такім чынам, з уваходам беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі ўвадзіўся шэраг змен для беларусаў: уводзіліся рэкруцкая павіннасць, пераход з пашчыны на чынш, разбор шляхты. І так нялёгкае становішча сялян станавілася яшчэ складаней. Шмат беларусаў выязджалі з імперыі ў іншыя краіны, бо жыць ў такіх умовах было немагчыма.